**Арцём Кавалеўскі**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

# ПЯЦЬ МІФАЎ, ЯКІЯ СУПРАВАДЖАЮЦЬ СТЭРЭАТЫПНЫ ІМІДЖ ПІСЬМЕННІКА ВА ЎЯЎЛЕННІ СУЧАСНАГА ЧЫТАЧА

*Міф першы: для напісання літаратурнага твора не трэба мець талент.*

Гэта перакананне, што глыбока ўкаранілася ў свядомасці абсалютнай большасці, абапіраецца на досыць сумнеўныя аргументы. Вельмі часта такое меркаванне выражаецца ў досыць катэгарычнай форме: аўтар, які не мае прыроджаных здольнасцей для стварэння мастацкага тэксту, ніколі не напіша нічога вартага, што назаўжды стане набыткам прыгожага пісьменства, калі не агульнасусветнага маштабу, то нават нацыянальнага. Маўляў, бесталанны аўтар можа колькі заўгодна намагацца, пісаць і пісаць, памыляцца і паўтарацца, але ніколі не створыць сапраўды па-мастацку годную рэч і напіша, у лепшым выпадку, толькі падробкі, фальсіфікуючыя тэксты больш таленавітых пісьменнікаў. Гэты міф сцвярджае, што альбо талент ёсць, і напісанне твора даецца, як кажуць, ад Бога, альбо таленту няма, і ніводны высілак не дапаможа аўтару-пачаткоўцу.

Такое меркаванне з’яўляецца больш чым памылковым, нягледзячы на тое, якая агромністая колькасць людзей падтрымлівае і ўспрымае яго ледзь не як аксіёму: усе сапраўдныя пісьменнікі нарадзіліся з мастацкім словам у вуснах і замест таго, каб адразу па нараджэнні зрабіць першы крык, яны адразу пачалі прамаўляць ямбамі і харэямі. Так падаецца многім.

Але тэорыя наяўнасці таленту не вытрымлівае нават самай лагоднай крытыкі, якая аспрэчвае закладзеную, прыроджаную наяўнасць пісьменніцкага таленту. Адна з версій такой крытыкі схіляецца да таго, што хаця б адзін абдзелены талентам пісьменнік-ахвяра стане прызнаным аўтарам пасля доўгіх гадоў невыноснай творчай працы. Але, мы павінны прызнацца ў гэтым, заўсёды былі і будуць пісьменнікі, якія імгненна хапаюць свой талент, і іх творы нараджаюцца па волі натхнення.

Парадокс вось у чым, і разам з тым выкрыццё першага міфа: ніхто не атрымлівае таленту прыгожага пісьменства імгненна. Ніводная кніга нават самага вялікага пісьменніка не пісалася без наяўнасці пэўных як творчых, так і прыватных праблем. Ніколі і нідзе. Усе пісьменнікі на пэўных этапах пачуваюцца тымі бесталаннымі пачаткоўцамі, якія

павінны ўпарадкаваць свае крамзолі перад тым, як выдаць сапраўдны твор. Усе пісьменнікі маюць брудныя ад працы рукі і знерваваныя твары ад тых ці іншых паразаў. І навошта так вульгарна і катэгарычна эксплуатаваць ідэю прыроджанага таленту, калі нараджэнне сапраўднага літаратурнага твора – гэта не проста праца, а звышпраца?

*Міф другі: добры пісьменнік умее толькі добра пісаць.*

Вельмі часта пісьменніка называюць асобай, якая здольная толькі ствараць мастацкія тэксты і не можа – у большай ці меншай ступені – нічога іншага. І тут зноў немагчыма згадаць пра большасць. Такога меркавання прытрымліваюцца тыя, хто ведае пра жыццё і творчасць пісьменніка выключна з сярэдняякасных кінематаграфічных стужак і аповедаў калялітаратурных асобаў пра жыццё мастакоў прыгожага пісьменства. Насамрэч якасць мастацкіх твораў літаратара залежыць ад мноства паказнікаў, а ступень пісьменніцкага рамяства з'яўляецца толькі адным з іх, бо праца пісьменніка – гэта кангламерат паняццяў, хаця б такіх першасных, як пабудова фабулы, драматургія псіхалагічных характараў і ўменне ствараць дарэчныя паўзы, напрыклад.

Пісьменнік можа быць кім заўгодна і рабіць што заўгодна. Але будучы кім заўгодна і робячы што заўгодна, ён пражывае сваё ўнікальнае жыццё, дзе тэкст – гэта спосаб не камунікацыі, а сапраўднага жыцця. Але праўды гэтай «сапраўднасці» творца вам ніколі не адкрые.

Працэс удасканальвання пісьменніцкага майстэрства – гэта працэс асобаснага росту. Калі пісьменнік піша, ён працуе, у першую чаргу, над сабой. А як тут абыдзешся без ведання жыцця па-за клавіятурай і па-за веданнем «ведання» жыцця як такога?

*Міф трэці: добрыя задумы рэдкія.*

Чарговае стэрэатыпнае перакананне, што сапраўднае прыгожае пісьменства – гэта нязвыклы дар, Божае натхненне, талент альбо, як яго часта называюць, міласць муз. Вось калі трапіць пісьменніку годная задума, як дар Боскі ў рукі, то неабходна ім – нябесным плодам – скарыстацца. Хтосьці падумае: вось яны, крылы, ад якіх ніяк не адмовішся і якімі трэба карыстацца як найхутчэй. Але замест таго, каб чакаць на крылы, хадзі і спачні ў садзе ці на двары. Альбо папросту засні. Трэба памятаць, што для літаратара задума – найпрасцейшая прынада. Дзіўна, але гэта факт, што пісьменнік адорваецца задумай, калі нават і не думае пра яе. І тады ён бярэ яе, думае над ёю і ператварае ў тое, што яму патрэбна – у твор, хай сабе і накід, але ў будучы твор. Зрэшты, многія пісьменнікі кажуць, што задумы твораў валяюцца пад нагамі. Але! Важная рэч: калі прыходзяць да літаратара першыя цікавыя задумы, не адра-

зу варта выплюхваць іх на аркуш, трэба даць ім час, каб адляжацца, выспець. І трэба памятаць літаратару-пачаткоўцу: тое, што не цяпер, то ў будучыні. А хто яе адмяняў?

*Міф чацвёрты: пісьменнікі надта самотныя.*

Большасць уяўляе сабе пісьменніка, яго персону, звычайна, за пісьмовым сталом, за аркушам паперы альбо за клавіятурай, куды, уткнуўшыся носам, літаратар упісвае чарговыя неўміручыя радкі. Ён самотны і зануранны ва ўласны свет. Так, праца літаратара гэтак і выглядае, і творцы насамрэч трэба больш часу, каб быць сам-насам. Пісьменнікі прачынаюцца сам-насам, ядуць сам-насам, нават пляткараць сам-насам. А яшчэ ўглядаюцца ў люстэрка. А што гэта, калі не жыццё на самоце? Але гэта не значыць, што жыццё і праца пісьменніка ператвараюцца ў суцэльную адзіноту. Літаратар павінен мець кантакт з вуліцай, прынамсі па-сяброўску: перад тым, як пісьменнік убачыць варты факт для свайго твора, ён спыніцца і спытае: «ці ён?» І калі адкажа, то стане пісаць. Альбо не стане? Калі б літаратар не пераймаўся над кожнай запыленай цявінкай альбо над кожнай збалелай і такой невыносна хворай кошкай… ці быў бы ён літаратарам?

*Міф пяты: існуе найлепшы і ўніверсальны спосаб стварэння мастацкай літаратуры.*

Калі хтосьці дае спіс правілаў для пісьменніка, а потым пачынае перасцерагаць перад імі, сцвярджаючы, што яны наогул непатрэбныя, бо яны не для кожнага і не для ўсіх, ён мае рацыю. Такога ўніверсальнага правіла і спосабу стварэння літаратуры не існуе. І пра гэта ведае кожны пісьменнік. Пісьменнік – не забарона. Пісьменнік – не сцяна. Пісьменнік – заўжды дарога. А калі дарога, то якая?

**Владимир Капцев**

*Белорусский государственный университет (г. Минск, Беларусь)*

## ИНТЕРТЕКСТУАЛЬНЫЕ ПРИЕМЫ В СОВРЕМЕННОЙ ЛИТЕРАТУРЕ И БИОГРАФИЧЕСКОЙ ПРОЗЕ

Явление интертекстуальности в контексте современной социокультурной ситуации вышло на рамки постмодернистского дискурса и в своем влиянии на массовое сознание стало многоуровневым явлением как в литературе, так и в медиасфере. Это означает, что существует определенная динамика интертекста, формируются различные подходы и принципы.